

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№49 (391) Серада, 1 снежня 2004 года www.gs.promedia.by



свежай
і разнастайнай
інфармацыі

ЗДАРЭННЕ

ПРАТЭСТАНЦКІЯ ВЕРНІКІ ТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ

На мінулым тыдні ўвечары ў 18.50 на трасе Ваўкавыск—Зэльва адбылася аўтамабільная аварыя. Машына Opel Astra, у якой знаходзіліся пратэстанцкія вернікі з "Царквы Адвентыстаў 7-га дня", сутыкнулася з бусам Fiat Ducato. Кіроўца "Опеля" памёр у шпіталі.

У той вечар ішоў мокры снег, і хаця дарога была ачышчана камунальнымі службамі, слой снегу пакрыў паверхню трасы мокрай кашай. Кіроўца, што вёз пратэстанцкіх вернікаў, ля павароту на Вайцехавічы не здолеў утрымаць аўтамабіль, і ён вылецеў на паласу сустрэчнага руху. Аўтамабіль павярнула бокам, і бус, які рухаўся ў супрацьлеглым напрамку, ударыў аўто з вернікамі ў раёне дзвярэй кіроўцы. Ад удару легкавы аўтамабіль вылецеў у кювет.

— Кіроўца буса не атрымаў пашкоджанняў. Кіроўцу і чатырох пасажыраў легкавіка даставілі ў шпіталь, дзе кіроўца неўзабаве памёр. Ён атрымаў вельмі цяжкія пашкоджанні. Аднаго чалавека адразу выпісалі, а астатнія, з траўмамі рознай цяжкасці, засталіся ў шпіталі, — сказаў ПАГОНІ намеснік начальніка ДАІ Ваўкавыскага РАУС Іван Пісар.

Кіроўца "Опеля" быў 1974 года нараджэння. Па інфармацыі супрацоўнікаў ДАІ, ён толькі год як атрымаў правы і гэта была ягоная першая зіма за рулём. Таксама ў ДАІ Ваўкавыскага РАУС нам паведамілі, што ў сувязі са смерцю кіроўцы крымінальная справа па факце ўзбуджана не будзе з-за адсутнасці вінавата. Па непацверджанай інфармацыі, у легкавіку знаходзіліся высокія чыны духоўнай іерархіі "Царквы Адвентыстаў 7-га дня". Аднак пацвердзіць ці абвергнуць гэтую інфармацыю журналісту ПАГОНІ не ўдалося.

Рыгор КАВАЛЬЧУК,
pahonia.promedia.by

НОВОСТЬ

НОТАРИУСЫ БУДУТ РАБОТАТЬ ДО 20 ЧАСОВ

С 1 декабря нотариальные конторы Гродненщины увеличат время работы. Как сообщила корреспонденту БелТА заместитель начальника управления юстиции Гродненского облисполкома Елена Юргель, каждый будний день они будут обслуживать клиентов до 20 часов, а в субботу в нотариальные конторы можно будет обращаться с 8 до 17 часов.

В самых крупных из них — в Гродно, Волковысском, Лидском, Слонимском и Сморгонском районах, где работает не менее 5 нотариусов, — будет налажено дежурство специалистов два раза в месяц по воскресным дням.

По данным собеседницы, на Гродненщине функционируют 24 нотариальные конторы в областном и каждом районном центре, а также в Скиделе, Березовке и Острино Щучинского района.

Ежемесячно одним нотариусом совершается более 150 нотариальных действий.

Увеличение времени работы этих учреждений создаст дополнительные удобства для клиентов, поможет им своевременно и оперативно получить необходимые нотариальные услуги, считает специалист.

БелТА

ФОТАФАКТ



А ногі белыя як снег,
І снег цяпер такі іскрысты.
Вакол чуваць дзявочы смех,
Калі ідуць баскетбалісты.
Мароз кусае за галёнкі,
Калені шчыпле і... вышэй.
Купіце, дзеўкі, ім валёнкі,
Каб не застацца без вушэй.

Фота Аляксандра ЗАХАРАНКІ

ПРАБЛЕМА

ЗАКРЫВАЮЦЬ ДОМ АФІЦЭРАЎ

ПОЛЬСКІМ КНІГАМ НЯМА ДЗЕ ПАДЗЕЦЦА

Першыя кветкі мы нясем матулі, першыя пачуцці зберагаем для Айчыны, а першыя песні дорым краіне. Воляю лёсу так атрымалася, што наш край жыве ў трох культурах, цесна сплеценых паміж сабой, — беларускай, рускай і польскай.

Але, не зважаючы на гэта, беларускія палякі заўсёды імкнуліся зберагчы сваю мову, культуру, традыцыі, перадаць іх малодшаму пакаленню, справядліва лічачы, што кожны народ мае права на памяць.

Таму з году ў год у Слоніме з'яўляюцца дзеткі, якія хочуць вывучаць польскую мову, польскія песні. А сёлета слонімская суполка Саюза палякаў на Беларусі вырашыла правесці конкурс сучаснай польскай паэзіі.

На свята паэзіі ў бібліятэцы, што на вуліцы Ружанскай, сабралася шмат людзей. Былі сярод іх не толькі палякі, але і беларусы, рускія. Вяла вечарыну студэнтка пятага курса Варшаўскага універсітэта сланімчанка Ганна Сакалоўская.

Настаўнікі польскай мовы, якія працуюць у школах горада, падабралі сваім вучням кранаючыя душу вершы сучасных аўтараў пра лёсы палякаў у свеце, пра прыгажосць роднага краю.

Дзеткі-дэкламатары спаборнічалі ў трох узроставых катэгорыях: да 12 гадоў, 12–16 гадоў і ад 16 гадоў. Самай малодшай удзельніцай конкурсу стала Хрысціна Жэльветра, якой журы прысудзіла трэцяе месца ў яе катэгорыі. А першыя месцы занялі Вікторыя Бараноўская, Юлія Груша і Дар'я Лях. Парадавала прысутных дэкламацыя вершаў Дзіяны Яфімавай, Максіма Гачыла, Маргарыты Кісялёвай, Ніны Слабадзянюк.

Ні адзін з удзельнікаў конкурсу не пайшоў з вечарыны без дыплома і падарунка ад Саюза палякаў.

Але свята не абышлося без лыжкі дзёгцю. Старшыня слонімскай суполкі Саюза палякаў на Беларусі Леанарда Рэўкоўская вымушана была звярнуцца да прысутных з вельмі непрыемнай навіной. Справа ў тым, што ўжо ў наступным годзе дзеці і дарослыя могуць быць пазбаўлены магчымасці чытаць польскія кніжкі.

Дзевяць гадоў таму, калі слонімская суполка толькі станавілася на ногі, палякі вырашылі сабраць сваю маленькую грамадскую бібліятэку, каб усе ахвотныя маглі чытаць польскамоўныя кнігі. Літаральна па хатах назбіралі каля трох тысяч асобнікаў кніг. Знайшлі памяшканне памерам шэсць квадратных метраў у Доме афіцэраў, зрабілі там рамонт, купілі паліцы, стол. На грамадскіх пачатках у бібліятэцы працавалі дзве жанчыны — Данута Ракевіч і Вацлава Яфіменка. Яны не толькі абслугоўвалі чытачоў у памяшканні бібліятэкі, але і заносілі кніжкі дадому хворым, нямоглым, інвалідам.

На жаль, у хуткім часе гэтыя намаганні могуць стаць толькі ўспамінамі. Справа ў тым, што з першага снежня Дом афіцэраў канчаткова ліквідуецца.

Як стала вядома з неафіцыйных крыніц, у гэтым памяшканні будзе месціцца аддзел ЗАГС і ўпраўленне сацыяльнай абароны насельніцтва.

Па словах намесніка камандзіра брыгады па маральна-псіхалагічным забеспячэнні Уладзіміра Зіноўева, закрыць Дом афіцэраў было рашэннем Савета Міністраў і Міністэрства абароны ў сувязі з рэфармаваннем арміі:

— Змены гэтыя датычацца і фінансавання арміі. Дамы афіцэраў закрываюцца не толькі ў Слоніме. Я ведаю, што ліквідаваны яны ў Гродне, Баранавічах, Брэсце. Арандатары, якія працавалі ў Доме афіцэраў, а гэта крама, цырульня і іншыя, — застануцца працаваць. Што да польскай бібліятэкі, то, па-мойму, яе там увогуле няма...

Вось такая атрымліваецца карціна: для некаторых людзей бібліятэка проста не існуе. Але яна ёсць! А Саюз палякаў не мае грошай, каб арандаваць памяшканне, і бібліятэкі горада польскія кнігі прыняць не могуць. Гарадскія ўлады, па словах Леанарды Рэўкоўскай, даўно не дапамагаюць суполцы: "Калісьці прасіла Касцюка, каб нашай касілкай нехта з рабочых выкасіў траву на польскіх могілках, бо сама не маю сіл, каб гэта зрабіць. Дык ён сказаў, што нагі яго там не будзе".

Расказвае самая актыўная чытачка бібліятэкі Ніна Харытончык:


— У рускай школе я праву́чылася толькі пару гадоў. У асноўным адукацыю атрымлівала ў польскай школе. Таму рускіх кніг амаль не чытала. Толькі польскія. Без нашай грамадскай бібліятэкі я проста жыць не змагу. Яна патрэбна мне як паветра.

Як паветра неабходна матчына мова і іншым наведвальнікам бібліятэкі, якіх за дзевяць гадоў яе існавання была не адна сотня. Што сёння рабіць з кнігамі, Леанарда Рэўкоўская не ведае:

— Калі ў 1939 годзе ў Слонім увайшлі савецкія войскі, яны пачалі паліць польскія кнігі. Тады польская бібліятэка была ў доме, дзе цяпер месціцца пашпартна-візавая служба. Старажылы памятаюць, як у вогнішчы над Шчарай палалі творы Сянкевіча, Славацкага... Няўжо зараз паўторыцца тая трагедыя?

Ліст да прафесара Стэльмахоўскага, кіраўніка грамадскай арганізацыі Саюза палякаў свету, і ў Сенат Польшчы падпісалі амаль два дзесяткі слонімцаў, якія спадзяюцца на дапамогу суайчыннікаў. А можа, і хтосьці ў нашым горадзе не застанецца абыякавым і таксама вырашыць дапамагчы людзям? Бо мы жывем у адной краіне, і калі сёння няма месца для польскіх кніг, то заўтра яго можа не стаць для беларускіх...

Яніна МЕЛЬНІКАВА



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

✓ Слонімцы падпісваюць ліст у абарону польскай бібліятэкі

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
30.11.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	700 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	8000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 210 - 2 500 руб.
Картофель	150 - 350 руб.
Капуста свежая	400 - 600 руб.
Морковь	500 - 1 000 руб.
Лук	600 - 1 000 руб.
Свёкла	300 - 500 руб.
Чеснок (за головку)	200 - 300 руб.
Помидоры	3 000 руб.
Бананы	1 700 руб.
Яблоки	500 - 1 500 руб.
Апельсины	2 200 - 3 000 руб.
Мандарины	2 000 - 3 500 руб
Лимоны	1 500 - 2 500 руб.
Киви (1 шт.)	450 - 600 руб.
Огурцы	3 500 руб.
Виноград	2 200 - 3 800 руб.
Перец	1 500 - 2 000 руб
Хурма	3 200 руб.
Говядина	600 - 8 800 руб.
Свинина	6 000 - 12 280 руб.
Сало (бочок) столовое	6 990 руб. 5 650 руб.
Сельдь	2 500 - 3 200 руб.
Макаронные изделия	1 000 - 1 500 руб.
Гречка	1 300 - 1 700 руб.
Рис	1 200 - 1500 руб.
Мука (2 кг)	1 900 - 2 300 руб.
Подсолнечное масло (1 л)	2 100 - 2 700 руб.
Мёд	13 000 руб.
Орехи грецкие	4 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
30.11.2004 г.

«Беларусбанк»		
	Покупка	Продажа
1 USD	2150	2190
1 EURO	2800	2920
1 ZL	595	685
1 RUR	75	78
«Белпромстройбанк»		
	Покупка	Продажа
1 USD	2175	2195
1 EURO	2830	2925
1 ZL	590	690
1 RUR	75,5	78
«Белагропромбанк»		
	Покупка	Продажа
1 USD	2170	2200
1 EURO	2770	2890
1 ZL	570	690
1 LAT	3300	4210
1 LIT	600	840
1 UAH	370	420
1 GBP	3300	4110
1 RUR	75	77,5
«Белгазпромбанк»		
	Покупка	Продажа
1 USD	2170	2195
1 EURO	2840	2920
1 RUR	75,8	77,2
Нацбанк РБ		
1 USD	2174	
1 EURO	2881,2	
1 RUR	76,99	
1 ZL	682,51	

ЗДАРЭННЕ

НІХТО НЕ ДАПАМОГ

Апоўдні 28 лістапада сланімчанка Вольга Селівонік зайшла купіць лекаў у цэнтральную слонімскую аптэку.

У руках жанчына трымала некалькі цэлафанавых пакетаў з прадуктамі. У адным з іх ляжаў кашалёк з грашыма і дакументамі.

"Я стала ў чаргу і пачала чакаць. Праз некаторы час пачула, як быццам нешта стукнула па пакеце. Азірнулася — за мной стаіць цыганка, а мой пакет ужо разрэзаны. Кашалёк, на шчасце, яшчэ быў на месцы. Я схапіла цыганку за руку і папрасіла маладую прадаўшчыцу, каб тая выклікала міліцыю. А яна мне ў адказ: "Ідзіце на вуліцу і там разбірайцеся!" Як яна магла такое сказаць?! Я хворая пенсіянерка, мне 63 гады. Цыганка ж маладая, здаровая — куды я з ёй пайду разбірацца? Трымала зладзейку за руку і нічога ж не прасіла, толькі міліцыю выклікаць. І ніхто не дапамог, нават слова ніхто ў маю падтрымку не сказаў, хоць у аптэцы тады было многа людзей. А прадаўшчыца — "ідзіце на вуліцу!.." Цыганка пад шумок туды і пайшла. Мяне гэта так уразіла, што забылася нават, якія лекі хацела купіць. Усю ноч не магла супакоіцца..." — дзялілася назаўтра сваёй крыўдай з карэспандэнтам "ГС" Вольга Паўлаўна.

Для пенсіянеркі гэта здарэнне каштавала нерваў. Ёй ніхто не дапамог, але свой кашалёк жанчына абараніла сама. Тыя ж, хто выбраў у гэтай сітуацыі пазіцыю "мая хата з краю", ад кішэннікаў таксама не застрахаваныя. Кішэнныя зладзеі выходзяць на свой злачынны промысел у людных месцах. І, як правіла, заўсёды знаходзяць сабе ахвяру.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННЕ

ДЗЯЎЧАТЫ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

Пры спробе прадухіліць на вуліцы хуліганскія дзеянні 22-гадовай сланімчанкі Б. пацярпелі на мінулым тыдні міліцыянеры патрульна-паставой службы.

Дзяўчына не толькі не падпарадкавалася работнікам міліцыі, але аказала ім фізічны супраціў і нават нанесла цялесныя пашкоджанні. Тым не менш хуліганку даставілі ў райаддзел міліцыі, дзе на яе быў складзены пратакол. Матэрыялы па справе хуліганкі перададзены ў пракуратуру.

Мікола КАНАНОВІЧ

ОПРОС

СЛОНИМ: НАШИ ЛЮДИ

НАШИ СОСЕДИ НАМ НЕ БЕЗРАЗЛИЧНЫ

Уже вторую неделю в Беларуси следят за политическим кризисом наших южных соседей — украинцев. Результаты президентских выборов там до сих пор не оглашены в официальной печати, а люди продолжают выходить на уличные митинги в поддержку "своих" президентов. Сегодня в Украине их три.

"Как вы оцениваете происходящие в Украине события?" — спрашивали корреспонденты "ГС" слонимчан 29 ноября.

Екатерина:
— Ситуация, в которой оказалась Украина, действительно серьезная. Страшно даже задуматься, что может произойти. Второй тур выборов, третий... А что потом? Хочется верить, что у украинских политиков хватит рассудка все это прекратить. В противном случае будет просто раскол в обществе.

Владимир:
— Я сам родом из Украины, мои родители из-под Харькова. Украина для меня не чужая страна. И украинцы тоже не чужие люди. Поэтому внимательно слежу за событиями в Киеве. Нет ничего хуже нестабильности в обществе. Верю, что все будет хорошо.

Андрей:
— То, что делают сегодня украинские политики, я расцениваю как очень большую глупость. С обеих сторон. Есть законы, которые создавали люди, выбранные народом. Только эти законы должны определять, как жить государству. Есть власть, которую выбрали. И это тоже закон. Никто не может объявить себя президентом. Это вне закона.

Ирина Климентьевна:
— Внимательно слежу за новостями. Очень настороженно отношусь к каждому повороту событий. Люди есть люди, они могут наделать глупостей. А весь народ должен отвечать за это.

Как показал опрос, большинство слонимчан внимательно следят за новостями из соседней державы. Потому что украинцы вместе с русскими всегда останутся для белорусов самыми добрыми соседями. Конечно, белорусы примут любой выбор украинского народа, главное, чтобы ситуация разрешилась мирно.


Янина МЕЛЬНИКОВА

З ЗАЛЫ СУДА

МУЖЧЫНА ПАСПЕЎ ПАДСТАВІЦЬ РУКУ ПАД УДАР

БІЦЬ ДЫК БІЦЬ

24 лістапада Слонімскі раённы суд вынес абвінаваўчы прыгавор па ч. 3 артыкула 339 Крымінальнага Кодэкса — злачынства на глебе расавай і нацыянальнай варожасці. Пад гэты рэдкі ў мясцовай судовай практыцы артыкул трапілі 21-гадовы Вадзім Верашчагін, 17-гадовы Аляксандр Барысевіч і 16-гадовы Ігар Ламака. У якасці пацярпелых у судзе праходзілі трое азербайджанцаў.


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Гэтая крымінальная гісторыя адбылася 29 жніўня гэтага года ў гаражна-складскім памяшканні азербайджанцаў, што знаходзіцца ў мікрараёне Панасоўка ў Слоніме. У той дзень туды накіраваліся Верашчагін, Барысевіч, Ламака і яшчэ трое іх таварышаў. Прыйшоўшы на месца, хлопцы надзелі на твары маскі, у некаторых з іх у руках былі кіі. У памяшканні склада знаходзіліся трое "асобаў каўказскай нацыянальнасці" і адзін мясцовы рабочы. Вадзім Верашчагін ударыў кіем аднаго з азербайджанцаў — Аліева — і пашкодзіў таму руку, якую апошні паспеў падставіць пад удар. Як сведчыў потым пацярпелы, калі б не рука, кій акурат лёг бы яму на галаву. Таварышы Аліева кінуліся яму на дапамогу і затрымалі Верашчагіна. На пытанне: "За што?" — Верашчагін паказаў фашысцкую свастыку ў сябе на грудзях і сказаў, што "яны не дадуць чарнамазым спакойна жыць на сваёй зямлі і будуць іх забіваць". Забойства, на шчасце, тады не адбылося, а таварышы Верашчагіна проста збеглі "з месца бою". У судзе яны скажуць, што ішлі ў гэты гараж без нейкай пэўнай мэты і не хацелі бойкі. Верашчагін дасць паказанні, што ў гаражы памахаў кіем толькі ён адзін. Ламака ў той час гнаўся з кіем за адным з азербайджанцаў на вуліцы. Барысевіч і астатнія ў гараж таксама не зайшлі, а потым проста ўцяклі.

Вадзіма Верашчагіна азербайджанцы здалі ў міліцыю. Але справа на тым не скончылася. Калі вечарам падлеткі не знайшлі старэйшага за іх на чатыры гады Верашчагіна ні дома, ні на дыскатэцы, то палічылі, што азербайджанцы ўтрымліваюць яго на складзе, і рушылі на выручку. Тады яны яшчэ не ведалі, што іх таварыш ужо дае паказанні ў міліцыі.

Калі Барысевіч і Ламака з сябрамі другі раз наведаліся ў склад на Панасоўцы, то нікога ўжо там не засталі. Затое спагналі злосць на двух аўтамабілях азербайджанцаў — павыбівалі ў машынах вокны і ўсё, што можна было разбіць. Такім чынам, маладыя людзі яшчэ і псавалі людзям маёмасць.

ПОМСЦІЛІ ЗА ЧУЖОГА БАЦЬКУ

"Мяркую, што матывы гэтай справы вядомыя — падсудныя ішлі разабрацца з канкрэтнымі людзьмі. Дарослы мужчына, бацька трох сыноў, у якога быў канфлікт з пацярпелымі, абудзіў прагу помсты ў сваіх сыноў, а потым і ў іх сяброў..." — сказала на судзе адвакат Ігара Ламакі.

Сапраўды, не так проста захацелася слонімскім хлопцам пакалаціць азербайджанцаў. Гэты самы бацька трох сыноў, рабочы водаканала Валадось, аднойчы вечарам на добрым падпітку зачапіўся сварыцца з азербайджанцамі каля іх гаража-склада.

Азербайджанцы п'янаму Валадосю-старэйшаму тады далі добры адпор. Мужчына падзяліўся сваёй крыўдай з сынамі, а тыя — са сваімі таварышамі. 29 жніўня двое братоў Валадосяў бавілі час у кампаніі з нашымі героямі.

Як паказаў потым у судзе адзін з братоў, Сяргей Валадось, тады і ўзнікла ідэя пайсці і адпомсціць азербайджанцам за бацькаву крыўду.

Хлопцы пайшлі і адпомсцілі за чужога бацьку. У дзеяннях саміх братоў складу злачынства следчыя не знайшлі. Валадосі і яшчэ некаторыя хлопцы з кампаніі праходзілі па справе як сведкі.

На лаве падсудных апынуліся толькі трое.

КОЖНАМУ СВАЁ

Няпоўнагадовых Ігара Ламаку і Аляксандра Барысевіча ў судзе абаранялі адвакаты. У судовай зале знаходзіліся таксама іх законныя прадстаўнікі — маці аднаго і другога.

Вадзім Верашчагін паслугамі адваката не карыстаўся. Не было ў зале і яго родных.

З асабовых характарыстык усіх траіх падсудных прагучала адна агульная дэталь — "курыць і ўжывае спіртное". На злачынства яны таксама пайшлі на падпітку.

Віну сваю ўсе трое прызналі толькі часткова. Не адмаўлялі відавочнага — пашкоджаную руку Аліева і пабітыя аўтамабілі. Аднак не прызнавалі, што дзейнічалі на глебе расавай ці нацыянальнай варожасці. У апошнім слове падсудныя прасілі даравадь ім у сваіх бацькоў і пацярпелых. Праўда, нікога з пацярпелых на той час у зале не было.

Адвакаты Барысевіча і Ламакі таксама імкнуліся даказаць, што ў дзеяннях іх падабаронных не было расавай ці нацыянальнай варожасці.

Адвакат Аляксандра Барысевіча прасіла суд пры вынясенні пакарання ўлічыць, што яе падабаронны ўпершыню прыцягваецца да крымінальнай адказнасці, з'яўляецца таленавітым маладым мастаком, які быў адзначаны за сваю творчасць у Беларусі і за мяжой. Тым больш што па першым эпізодзе ў Барысевіча не было складу злачынства — за гаражом ён выкінуў свой кій, потым проста ўцёк, і толькі вечарам разам з іншымі ён біў машыны.

Адвакат Ігара Ламакі імкнулася пераканаць суд, што ў дзеяннях яе падабароннага наогул не было складу злачынства. Па меркаванні адваката, калі першы раз хлопцы прыйшлі ў гараж, то Ламака пад уздзеяннем "статкавага інстынкту" разам з іншымі пагнаўся на вуліцы за адным з пацярпелых, але не біў яго. А вечарам у гаражы ён толькі ненаўмысна звярнуў люстэрка ў адной з машын, бачыў, як Барысевіч і іншыя разбівалі машыну, але сам у гэтым не ўдзельнічаў. Адвакат прасіла вынесці Ламаку апраўдальны прысуд. Зрэшты, нічога іншага ёй і не заставалася. Яе падабаронны ў гэтым годзе ўжо быў асуджаны за нанясенне цялесных пашкоджанняў у Міхайлаўскім скверы ў Мінску "асобам каўказскай нацыянальнасці" і атрымаў два гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай прысуду на два гады.

Вадзім Верашчагін у сваё апраўданне не сказаў нічога. Затое свастыка і яго словы ў адрас пацярпелых пры вынясенні прысуду сыгралі сваю ролю. Суд палічыў даказанай віну ўсіх траіх.

Верашчагін атрымаў тры гады абмежавання свабоды і застаўся пад падпіскай аб нявыездзе да адбыцця "на хімію". Барысевіча асудзілі на тры гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай пакарання на год і пакінулі на гэты час пад падпіскай аб нявыездзе. А вось Ігару Ламаку да ранейшай судзімасці дадалася новая, і ўсё разам пацягнула на тры гады і тры месяцы папраўчай калоніі. Пасля абвяшчэння прыгавору Ламаку адразу ўзялі пад варту ў зале суда. Яго маці заплакала.

Акрамя таго, што дзеці атрымалі судзімасць, бацькі няпоўнагадовых Ламакі і Барысевіча яшчэ павінны будуць заплаціць пацярпелым за разбітыя машыны.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ДАРАГІ КАШАЛЁК

Днём 28 лістапада на калгасным рынку ў Слоніме з кішэні футра гандляра А. пры невядомых абставінах знік кашалёк, у якім ляжала каля 1 000 даляраў ЗША. Мужчына звярнуўся па дапамогу ў міліцыю.

Узбуджана крымінальная справа. Міліцыя вядзе пошук.

ЗАБРАЛІ ТРУБЫ

Сярод белага дня 27 лістапада ля крамы "Ромашка" на Чырвонаармейскай вуліцы ў слонімца Б. ўкралі дзве азбеставыя трубы.

Мужчына зусім ненадоўга пакінуў свой тавар без нагляду, а калі вярнуўся — забіраць ужо не было чаго. Хто забраў чужыя трубы, спрабуюць высветліць работнікі міліцыі.

ЗЛОДЗЕЯ ВЫЛІЧЫЛІ

25 лістапада з памяшкання тэатра "Этуаль" у РДК у адной з жанчын знікла 65 тысяч рублёў. Работнікі міліцыі ўстанавілі асобу злодзея. Ім аказаўся раней падсудны слонімец С.

Як высветлілася пазней, С. у жніўні гэтага года ў адным з кабінетаў РДК украў 106 тысяч рублёў.

УКРАЛІ МАБІЛЬНЫ ТЭЛЕФОН

На мінулым тыдні рабочы ТАА "Зодчы" Ж. заявіў у міліцыю пра тое, што ў яго на працы знік мабільны тэлефон.

Пошукамі мабільніка цяпер займаецца міліцыя.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРИЯТНАЯ ВСТРЕЧА



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

✓ Михаил Харченко проводит экскурсию в своём музее

«АЛЫЕ ПОГОНЫ» В СЛОНИМЕ

Воскресным днем на территории 11-й отдельной механизированной бригады белый цвет снега и камуфлированная форма военнослужащих была разбавлена алым цветом погон приехавших учащихся Минского суворовского училища.

Будущие защитники Отечества побывали на экскурсии в прославленном соединении, посетили музей военного мундира и атрибутики, казармы танкистов и связистов, пообедали в солдатской столовой.

Больше всего воспитанникам училища понравился музей старшины Михаила Харченко.

Ребята воочию увидели образцы военной формы и принадлежности к ней. Из слов Михаила Ивановича они узнали, что униформой называют одежду, установленную правилами или специальными указами, ношение которой является обязательным для любой воинской части и для каждого рода войск.

Гости сфотографировались на память в одежде и головных уборах прошлых времен. По словам командира роты суворовцев подполковника Путятова, дети много ездят на экскурсии по всей Беларуси, но такое они увидели впервые. На память о своем пребывании учащиеся Минского СВУ оставили шеврон и суворовский знак.

Александр ЗАХАРЕНКО

ОТЗЫВ НА ПУБЛИКАЦИЮ

СКУПОЙ ПЛАТИТ ДВАЖДЫ

В «Газеце Слонімскай» от 24 ноября (№48) была напечатана статья «Надвигается зима, и пустеют кошельки».

В ней приводились цены отдельных групп товаров, которые реализуются в ОАО «Дом торговли». Приведённые цены по некоторым группам были завышены в 2–3 раза. Поэтому сегодня хочется привести реальные цены на некоторый зимний ассортимент в нашем магазине: женская зимняя обувь у нас стоит 50–155 тыс. руб., перчатки кожаные – 13–44 тыс. руб., свитера женские – 8–35 тыс.руб.

Что касается пальто женских производства Польши и России, то в последние годы в нашем предприятии реализуется одежда только отечественных производителей.

Кроме того, если сравнить цены (о чём говорилось в статье) у нас на предприятии и на рынке, то хочется подчеркнуть, что у нас цены соответствуют качеству реализуемых изделий, весь товар сертифицирован, на всю обувь (она у нас только из натуральной кожи) установлены гарантийные сроки от 30 до 75 дней, право обмена или возврата в установленные сроки. Кроме того, мы предоставляем такую удобную форму расчёта, как кредит с отсрочкой оплаты за товар до 6 месяцев.

Конечно, каждый покупатель вправе выбирать, где ему приобрести товары: в магазинах или на рынке. Однако, прежде чем решить этот вопрос, вспомните хорошую пословицу: скупой платит дважды. Думается, что широкий ассортимент товаров, их качество и гарантии, предоставление скидок на отдельные товары приведут вас в наш магазин.

Тамара ЛАГОНДА, директор ОАО «Дом торговли»

БЕЛТРАНСГАЗ

У СНЕЖНІ КАЛЯ ГАНЬКОЎ ПАЧНЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА КАМПРЭСАРНАЙ СТАНЦЫІ

Пра тое, што каля вёскі Ганькі Слонімскага раёна хутка пачнецца будаўніцтва кампрэсарнай станцыі, карэспандэнту "ГС" паведаміў начальнік упраўлення магістральных газаправодаў Юрый Бяссонаў.

Па словах Юрыя Валянцінавіча, на аб'екце будуць працаваць рабочыя падрадных арганізацый альбо набірацца людзі будаўнічых спецыяльнасцей з нашага раёна. Гэта пытанні ў кампетэнцыі тых арганізацый і фірмаў, якія пачнуць будаўніцтва кампрэсарнай станцыі. Генеральным падрадчыкам будаўніцтва з'яўляецца "Белбудтрансгаз". А само ўвядзенне аб'екта будзе весціся за кошт фінансавых сродкаў расійскага "Газпрама". Здаць яго плануецца ў канцы снежня наступнага года.

Пасля таго, як кампрэсарная станцыя пачне працаваць, яна перайдзе ў падпарадкаванне Слонімскага ўпраўлення магістральных газаправодаў.

"Штодатычыцьспецыялістаў, – сказаў Юрый Бяссонаў, – то падрыхтоўка іх ужо ідзе цяпер. Патрабаванні да будучых спецыялістаў вельмі сур'ёзныя. Адукацыя іх павінна быць не ніжэйшай за тэхнікум і інстытут. Эксплуатаваць станцыю будуць каля 50 чалавек.

Калі гаварыць пра жыллё для спецыялістаў, дык у нашым упраўленні існуе чарга на кватэры. І, згодна з гэтай чаргой, людзі іх атрымліваюць. Нядаўна ўзвялі дом на 28 кватэр. Плануем хутка пачаць будаўніцтва яшчэ аднаго дома на 55 кватэр". Нагадаем, што будаўніцтва новай кампрэсарнай станцыі неабходна для таго, каб транспартаваць газ па магістралі "Ямал–Еўропа".

Сяргей ЧЫГРЫН

АДПАЧЫНАК

ДЗЁННІК ПАКАЗАЎ – І ТАНЦУЙ

Цікавую акцыю для школьнікаў пачалі праводзіць на слонімскай дыскатэцы "Оскар".

Як сказаў карэспандэнту "ГС" кіраўнік дыскатэкі Міхаіл Рудак, акцыя гэта заключаецца ў тым, што кожны тыдзень да новага года на дыскатэку для дзяцей выхаднымі днямі з 16 да 19 гадзін школьнікі праходзяць бясплатна.

Для кожнай школы адведзены спецыяльныя выхадныя дні, калі вучні, паказаўшы дзённікі, праходзяць на дыскатэку і танцуюць. адпачываюць. Так ужо павесяліліся дзеці гарадскіх школ №№1–4. Напердзе чакае бясплатны адпачынак і вучняў з іншых школ.

Са слоў Міхаіла Рудака стала вядома, што 25 снежня "Оскар" адзначыць сваё пяцігоддзе. Моладзь павесяліцца і падчас святочнай дыскатэкі на Новы год.

Сяргей ЧЫГРЫН

СТАТИСТИКА

ДЕРЕВНЯ ВЫМИРАЕТ

В январе–сентябре этого года в Слонимском районе количество умерших превысило количество новорожденных жителей на 287 человек.

Как сообщил отдел статистики Слонимского райисполкома, за период с января по сентябрь зарегистрировано 545 рожденных и 846 умерших жителей, в том числе городских 414 и 428, сельских 131 и 418 соответственно.

По сравнению с таким же периодом прошлого года число новорожденных увеличилось на 10,8% (53 человека), умерших – на 1,6% (13 человек).

Кроме того, районными отделами загс зарегистрировано 354 брака (на 23 брака меньше, чем в январе–сентябре 2003 года). А вот количество разводов за аналогичный период уменьшилось на 36 и составило 133.

Янина МЕЛЬНИКОВА

ТРЭЦІ СЕКТАР

"ВОЛЯ" СТАЛА ВОЛЬНАЙ

Кіраўнік Слонімскага грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця" Міхась Варанец атрымаў паведамленне з пракуратуры, што крымінальная справа ў дачыненні да яго канчаткова спынена.

Нагадаем, што ў красавіку гэтага года ў дачыненні да Варанца была ўзбуджана крымінальная справа за нібыта няўплату падаткаў па праграме TACIS.

У сувязі з гэтым у грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця", якую ўзначальвае Міхась Варанец, была арыштавана аргтэхніка. Увесь гэты час цягнуліся судовыя разбіральніцтвы ў гаспадарчых судах, у выніку якіх было даказана, што грамадскае аб'яднанне не мусіла плаціць тыя падаткі, якія патрабавала падатковая інспекцыя.

Такім чынам, аказалася, што склад злачынства, у якім абвінавачваўся старшыня слонімскай арганізацыі, папросту адсутнічае. У сувязі з гэтым крымінальная справа, узбуджаная супраць яго, спынена 10 лістапада. А 17 лістапада падатковая інспекцыя вярнула Міхасю Варанцу арыштаваную маёмасць.

Мікола КАНАНОВІЧ

ШКОЛА

ДЕТЕЙ И ВЗРОСЛЫХ ПРИГЛАСИЛО «ИСПАНСКОЕ КАФЕ»

Днями в СШ №4 г.Слонима прошёл вечер под названием «Испанское кафе».

И это не случайно. Как известно, наша школа – единственная в городе, где изучаются язык, культура и традиции Испании.

Во время вечера звучали песни, стихи известных испанских поэтов, проводились конкурсы, ребята танцевали арабские и латиноамериканские танцы.

Концертную программу подготовили ученики 7 и 9–11-х классов под руководством учителей испанского языка Светланы Светловой, Виктории Юрчак и Лидии Круглик.

Вечер понравился всем присутствующим. Вот что о мероприятии сказала ведущий инспектор управления образования Слонимского райисполкома Наталья Логач: «Всё было чудесно. Я очень много услышала испанских произведений, узнала, что гитара – это основной музыкальный инструмент этой страны, что в Испании проводят много праздников. В целом всё получилось великолепно».

Вероника БУТА, ученица СШ №4 г.Слонима

КУЛЬТУРА

ВЕЧАРЫНА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ

У Сялявіцкай сярэдняй школе адбылася літаратурная вечарына, прысвечаная 90-годдзю беларускага паэта Валянціна Таўлая. Яе арганізавала і правяла разам з вучнямі намеснік дырэктара школы па вучэбнай рабоце Раіса Клёсава.

Падчас вечарыны гучалі вершы Валянціна Таўлая ў выкананні вучняў школы, а таксама паэтычныя радкі, прысвечаныя нашаму паэту-земляку.

"Першаю скрыпкаю" вечарыны быў госць школы – доктар філалагічных навук Мікола Арочка. Мікалай Мікалаевіч у 1969 годзе выдаў кніжку "Валянцін Таўлай". Ён шмат даследаваў творчасць юбіляра, таму расказаць настаўнікам і вучням было што. Найперш прысутных цікавілі невядомыя раней факты жыцця і творчасці Валянціна Таўлая.

Сяргей ЧЫГРЫН

ВОПРОС – ОТВЕТ



ЛЮДЕЙ ВОЛНУЕТ КАЧЕСТВО ПРОДУКТОВ И ЭКОЛОГИЯ

Фота з архіва "ГС"

✓ Говорят, качество слонимского хлеба стабильное...

На Гродненщине в октябре прошёл единый день информирования населения. В ходе этого мероприятия представителям областной информационно-пропагандистской группы был задан ряд вопросов от населения области, в том числе и от жителей Слонима, Зельвенского, Волковысского и Мостовского районов. Сегодня мы публикуем некоторые ответы на вопросы, опубликованные в «Гродзенскай праўдзе».

Слоним

Вопросы от жителей Альбертина.

— В Слониме плохое качество реализуемого хлеба. Как исправить положение?

— Филиал «Слонимский хлебозавод» в настоящее время выпускает 62 наименования хлебобулочных изделий. Ассортиментный перечень выпускаемой продукции согласован с санитарной службой. На производимую продукцию имеются действующая нормативная документация, технологические инструкции.

Комиссией облисполкома, возглавляемой заместителем председателя облисполкома, в октябре текущего года проведена проверка хлебобулочных изделий в филиале «Слонимский хлебозавод», в ходе которой установлено, что в сентябре 2004 года предприятием осуществлялась отработка технологических режимов при переходе на новый ассортимент (хлеб «Барский», «Майский формовой», «Гомельский заварной»), в период которой показатели качества хлеба могли измениться. В этот период имели место устные обращения граждан с жалобами на качество хлеба.

На данный момент технология отработана. Качество выпускаемых хлебобулочных изделий остаётся стабильным. Рекламаций и жалоб со стороны торгующих организаций Слонимского района комиссией не зарегистрировано.

— Просьба улучшить автобусное сообщение с центром города.

— В конце ноября 2004 года будет изменено расписание движения автобусов городского маршрута №8 «Звёздная — площадь Ленина», организовано экспресс-движение по маршруту №10 «Площадь Ленина — улица Барановичская».

ДУП «Автобусный парк №3» планирует организовать регулярный обычный маршрут №9 «Рынок Коссовский — улица Звёздная» и аналогичный экспресс-маршрут.

— Просьба открыть в поселке Альбертин мини-рынок.

— Решением Слонимского райисполкома «Об установлении постоянных мест размещения мелкорозничной торговли» установлены постоянные места для мелкорозничной торговли, в том числе для планируемого мини-рынка в микрорайоне Альбертин. В настоящее время выделен земельный участок и разрабатывается план застройки мини-рынка.

— Требует ремонта проезжая часть улиц.

— Для улучшения благоустройства микрорайона Альбертин в текущем году выполнен ямочный ремонт улиц Фабричной, Победы. Заасфальтирован участок улицы Колхозной, отремонтирован тротуар на мосту через реку Исса. В следующем году работы по улучшению благоустройства улиц будут продолжены.

— Когда прекратятся перебои в Альбертине с горячей водой?

— Для улучшения теплоснабжения и горячего водоснабжения Слонимским ГУП ЖКХ заключен договор со специализированной организацией на выполнение работ по наладке сетей теплоснабжения. Теоретические расчеты уже выполнены, в ближайшее время начнутся работы на сетях. В центральном тепловом пункте по улице 1-ой Семилетки ведутся работы по установке циркулярного насоса. Дирекции ОАО «Слонимский картонно-бумажный завод «Альбертин» направлено письмо с просьбой соблюдать температурный график подачи теплоносителя.

Зельва

Вопросы жителей Кремяницкого сельского Совета. Их на сегодняшний день волнуют две проблемы: попадание в реки жидких стоков со свиноводческого комплекса «Самаровичи» и почему не разрешают детям ловлю рыбы на местном озере (д. Князево)?

— Свиноводческий комплекс «Самаровичи» введен в эксплуатацию в 1983 году. В настоящее время здесь содержится около 21 тысячи свиней. Ежесуточно образуется около 170 м. куб. стоков, которые по коллектору поступают на чеки-отстойники и в накопители, откуда должны вывозиться на поля СПК «Прогресс–Князево». Действительно, имели место случаи, когда из-за выхода из строя транспорта и дефицита горючего, перегрузки накопителя отходы комплекса попадали в пойму реки Мартыновка.

В 1994 году началось расширение очистных сооружений комплекса. Построено 6 чеков-отстойников, 2 чека-накопителя, проведен ремонт трубопровода. Общая сметная стоимость объекта 779, 26 тыс. руб. в ценах 1991 года. На 1.10.2004 г. выполнены работы на суму 481,69 тыс. руб. (в ценах 1991 года). Окончание строительства предусмотрено в 2005 году.

Природоохранной службой ведется постоянный контроль за соблюдением на комплексе водоохранного законодательства. Должностные лица неоднократно подвергались административным штрафам. Для возмещения ущерба, причиненного окружающей среде, ОАО «Гроднохлебопродукт», на балансе которого находится свинокомплекс «Самаровичи», в 2003 году предъявлен иск в размере 883 млн. рублей. Вопрос о завершении строительства очистных сооружений рассматривался на коллегии областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды с участием представителей ОАО «Гроднохлебопродукт». В текущем году случаев загрязнения окружающей природной среды навозосодержащими стоками не установлено.

— Водоем д. Кремяница, решением райисполкома переданный в аренду фермерскому хозяйству С.С.Леуты, предназначен для производства товарной рыбы и зарыблен мальками щуки, белого амура, толстолобика и карпа. Согласно Правилам любительского рыболовства РБ, в угодьях, где проводятся работы по зарыблению, любительское рыболовство может быть ограничено или полностью запрещено. В соответствии с правилами запрещается любительский лов рыбы, не достигшей минимально допустимых размеров. Любительский лов рыбы был временно ограничен, потому что рыба не набрала промыслового размера.

По результатам проверки руководителю фермерского хозяйства С.С.Леуте был выдан акт-предписание: убрать аншлаги, информирующие, что пруд является частной собственностью, до начала купального сезона оборудовать купальный мини-пляж, обозначить места, отведенные для любительского рыболовства, и определить его режим, произвести известкование ложа пруда. В случае невыполнения предписания руководитель фермерского хозяйства будет привлечен к административной ответственности.

Подготовил Сергей ЧИГРИН

НАВІНЫ

ГРУШУ АДНЫ ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ, ДРУГІЯ ТРАСУЦЬ

ЛІДА. Лідскі мастак і скульптар Рычард Груша, які ў Беларусі вядомы тым, што вырабіў ды ўсталяваў шмат дзесяткаў памятных знакаў, прысвечаных важным гістарычным падзеям Беларусі, – і ў большасці на дабрачынных пачатках, – цяпер знаходзіцца са сваёй майстэрняй на раздарожжы.

У свой час ён звярнуўся ў міністэрства культуры краіны з прапановаю стварэння ўласнай карціннай галерэі, музея камянёў і каменнага дойлідства. Міністэрства падтрымала гэтую ідэю і паабяцала дапамагаць у вырашэнні арганізацыйных пытанняў, пры гэтым засяродзіла ўвагу на выкананні ўмоў, што павінны адпавядаць установе такога тыпу. Усе яны лёгка вырашаюцца.

Аднак такая ідэя засталася толькі ідэяй. Уладальнік тэрыторыі – ДП "Лідабудканструкцыя" – нечакана павысіў плату за плошчу, якую арандаваў Р.Груша, звярнуўся ў Гродзенскі гаспадарчы суд і выйграў справу. Цяпер мастак стаіць перад фактам, што павінен пакінуць гэтую тэрыторыю да канца месяца.

Стварэнне унікальнай галерэі на тэрыторыі Беларусі адкладзена на нявызначаны тэрмін.

ГЕДЫМІНА ПАСАДЗІЛІ НА КАНЯ

ЛІДА. Беларусь была амаль адзінай краінай, якая не мела коннага помніка нацыянальнаму герою, такому, напрыклад, як Пётр І у Расіі ці Багдан Хмяльніцкі ва Украіне.

Не так даўно кіраўнік праекта Анатоль Белы, скульптар Аляксандр Лушчык ды архітэктар Мікалай Курылін паказалі старшыні Лідскага райвыканкама Андрэю Худыку макет коннага помніка Вялікаму князю Літоўскаму, заснавальніку горада – Гедыміну. Манумент уяўляе фігуру Вялікага князя на kані з працягнутаю рукою. У руцэ князь трымае булаву – сімвал дзяржаўнай улады.

Скульптуру ўстановяць насупраць Лідскага замка, а працягнутая рука будзе скіравана на новую сталіцу княства – Вільню, куды перамясціў яе Гедымін з Навагрудка.

На нарадзе дамовіліся, што велічыня помніка складзе 1,5 фігуры. Ён будзе гатовы ўжо праз некалькі месяцаў. На яго адліўку пойдзе каля чатырох тон бронзы.

ТЭЛЕФОНЫ РАТУЮЦЬ СЕЛЬГАСТЭХНІКУ

МАСТЫ. Самай прыбытковай справай для Мастоўскай аграпрамтэхнікі з'яўляецца не рамонт сельгастэхнікі, дзеля чаго было створана гэта прадпрыемства, а выраб тэлефонных апаратаў. На участку выпуску тэлефонных апаратаў і жгутоў працуюць 49 чалавек. Яны штомесяц выпускаюць прадукцыі амаль на сто мільёнаў рублёў.

Аб'ём вытворчасці павялічыўся ўдвая ад мінулагодняга. Прадпрыемства можа яшчэ ганарыцца тым, што сем з дзесяці аўтобусаў, выпушчаных на аб'яднанні "АўтаМАЗ", укамплектаваны іх жгутамі. На сённяшні час падпісана дамова на выраб жгутоў для тралейбусаў.

Што да рамонту тэхнікі, то, нягледзячы на заканчэнне палявых работ, ні адно сельгаспрадпрыемства не звярнулася туды па дапамогу. Такі стан спраў там тлумачаць адсутнасцю грошай у калгасаў.

ЗАРОБАК ЗНІЖАЕЦЦА – ЦЭНЫ РАСТУЦЬ

МАСТЫ. Згодна з дзяржаўнай статыстыкай, кошт спажывецкіх тавараў у верасні гэтага года павялічыўся адносна жніўня на 0,1 працэнта.

Разам з тым, як сведчыць аддзел статыстыкі па Мастоўскім раёне, сярэдні заробак мастоўцаў у верасні склаў 286,6 тысячы рублёў і паменшыўся адносна папярэдняга месяца на 12,1 працэнта.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗДАРЭННІ

ЯК У СЕРЫЯЛЕ

ДЗЯТЛАВА. Гісторыя, падобная на сюжэт з кінасерыяла "Участак", адбылася нядаўна ў вёсцы Раготна Дзятлаўскага раёна.

За адну ноч з 13 пралётаў лініі электраперадач невядомыя зламыснікі абрэзалі больш як два кіламетры электракабелю. Знікненне дратоў на слупах выявілі толькі на наступны дзень.

Як паведамляе "Міліцэйскі веснік", толькі па мінімальных падліках сума страты, якую нанеслі начныя зладзеі прадпрыемству "Гроднаэнерга", складае 400 тысяч рублёў.

ПАГАСЦЯВАЛА БАБУЛЯ Ў ДЗЕДА

ДЗЯТЛАВА. 78-гадовы жыхар вёскі Раманавічы Дзятлаўскага раёна запрасіў на вечар у госці 60-гадовую мясцовую "маладуху". Як звычайна бывае, спачатку выпілі, закусілі. Але потым, нечакана для гаспадара, справа набыла зусім не той абарот, на які спадзяваўся дзед.

Паводле "Міліцэйскага весніка", жанчына адкрыта ўкрала ў гаспадара 80 тысяч рублёў і пакінула хату. Пакрыўджанаму старому каваleру нічога іншага не заставалася, як звярнуцца па дапамогу ў міліцыю.

ПАЗДЫМАЛІ ДАРОЖНЫЯ ЗНАКІ

ШЧУЧЫН. На некаторых участках шашы Мінск – Гродна ў Шчучынскім раёне зніклі звыш двух дзесяткаў дарожных знакаў, якія паказвалі на небяспечны паварот. Знакі былі зроблены з дзюралюмінію і пакрыты святлоадлюстравальнай фарбай.

Невядома, што збіраюцца рабіць зладзеі з дарожнымі знакамі, магчыма, упрыгожаць імі плот. Тым часам сума страты, якую панесла мясцовае ДЭУ-13, што абслугоўвае гэты ўчастак дарогі, склала больш за мільён рублёў. І гэта без аплаты працы дарожнікаў за ўстаноўку знакаў. Як адзначае "Міліцэйскі веснік", сем аналагічных дарожных знакаў укралі таксама і ў Лідскім раёне.

Мікола КАНАНОВІЧ

СМЯРОТНЫ НАЕЗД

МАСТЫ. На шашы Шчучын–Масты ля хутара Ельня аўтамабіль наехаў на пешахода. Уратаваць жыццё пацярпелага не ўдалося.

Антон МАКЕЙ

ВОЛКОВЫСК

ОШТРАФОВАЛИ ЗА ГОЛОДОВКУ

Судья Волковысского районного суда Юрий Якимович 25 ноября постановил оштрафовать на 1 млн. 200 тыс. рублей учредителя и главного редактора волковысского негосударственного еженедельника «Местная газета» Андрея Шенторовича.



✓ Андрей Шенторович — главный редактор «Местной газеты»

Свое решение судья мотивировал тем, что с 20 октября по 9 ноября Шенторович, находясь в волковысском корпункте «Местной газеты», проводил пикетирование в виде голодовки без соответствующего разрешения Волковысского райисполкома.

Напомним, что, объявив голодовку, Шенторович протестовал против решений Министерства информации о вынесении «Местной газете» предупреждения за нарушение законодательства и о приостановлении на месяц ее выпуска. А.Шенторович заявил о своем несогласии с обвинением. По словам журналиста, 20-дневной голодовкой он выражал свою собственную волю. «Во время этой акции, которая не носила публичный характер, я не ходил по городу и не распространял свои взгляды», — отметил он.

Адвокат Александр Бирилов также заявил, что личная голодовка журналиста не была пикетированием — публичным выражением личных, групповых или общественно-политических интересов или протеста, носящим массовый характер. А.Бирилов отметил, что в суде не были представлены документы, подтверждающие факт пикетирования, а значит — отсутствует состав правонарушения. Однако суд не принял эти заявления во внимание.

Председатель гродненского филиала республиканского общественного объединения «Белорусская ассоциация журналистов» Павел Можейко, комментируя БелаПАН решение суда, заявил: суровое постановление о крупном штрафе направлено на то, чтобы запугать журналистов, которые своими острыми материалами стремятся повлиять на мировоззрение общества.

БелаПАН

НАВІНА

ЛАРЫСА ГЕНІЮШ — НА ПАШТОЎЦЫ

У Мінску выйшла з друку арыгінальная каляровая паштоўка, прысвечаная беларускай паэтцы Ларысе Геніюш.

Паштоўку падрыхтаваў і выдаў стваральнік і кіраўнік музея-сядзібы выяўленчага мастацтва ў г. Старыя Дарогі Мінскай вобласці Анатоль Белы.

На паштоўцы адлюстраваны помнікі Ларысе Геніюш у Зэльве і ў Старых Дарогах, змешчаны тэкст мемарыяльнай шыльды, якая была ўсталявана ў зэльвенскай праваслаўнай царкве, а таксама фотаздымак беларускай творчай інтэлігенцыі, якая прымала ўдзел у адкрыцці помніка паэтцы ў Зэльве ў мінулым годзе.

Гэта ўжо другая паштоўка, прысвечаная Ларысе Геніюш, якая выдаецца з добрай ласкі Анатоля Белага. Таму сёння хочацца расказаць трохі і пра гэтага рупліўца на ніве беларускага адраджэння, а таксама пра яго справы.

Адкрыццё прыватнага музея ў Старых Дарогах адбылося пяць гадоў таму. Цяпер музей-сядзіба налічвае больш за 3 000 твораў выяўленчага мастацтва. З ініцыятывы Анатоля Белага на тэрыторыі музея ўсталявана каля 20 помнікаў розным славутым людзям Беларусі, а таксама помнікі Еўфрасінні Полацкай, Францішку Скарыну, Міколу Будному і Міколу Гусоўскаму на тэрыторыі Белдзяржуніверсітэта ў Мінску. Анатоль Белы падрыхтаваў і выдаў дзесяткі розных паштовак, буклетаў і плакатаў, прысвечаных роднай Беларусі і яе людзям.

Сяргей ЧЫГРЫН



К СВЕДЕНИЮ

БЕСПЕЧНОСТИ ЭЛЕКТРИЧЕСТВО НЕ ПРОЩАЕТ

Во время реконструкции воздушной линии в Слонимском районе в деревне Шиловичи по улице Король энергоинспекция в октябре-ноябре провела работу по техническому обследованию электроустановок бытовых потребителей у жителей деревни.

Несмотря на то, что основным условием безопасного применения электроэнергии в быту является исправное состояние электрической проводки и электроприборов и соблюдение мер предосторожности при пользовании электрическими приборами, при обследовании выявлен ряд замечаний.

Так, например, электропроводка к хозпостройкам у жителей Петрашко Н.В., Тарасевича И.А., Бондаровича С.А., Грипич П.Ф. и других абонентов энергии выполнена с нарушением требований правил. Электропроводка имеет во многих местах повреждения, провода подвешены на временных стойках, а порой лежат просто на земле. По требованиям правил провода должны быть правильно проложены, надёжно закреплены и не должны подвергаться повреждениям. Ветхая электропроводка, повреждённая изоляция и оголенные концы проводов могут явиться причиной пожара и несчастного случая. Во избежание повреждений изоляции проводов нельзя зажимать их дверями или предметами домашней обстановки, заклеивать обоями, бумагой, недопустимо укреплять провода гвоздями, подвешивать на них какие-либо предметы или вещи. Во многих домах смонтированы электрические розетки на 220 В на улице. А это категорически запрещается.

Рита ЛИМ,
инспектор Слонимской энергоинспекции

БЕЛАРУСЬ І СМІ

ПРЫПЫНЕНА ГАЗЕТА "БІРЖА ІНФАРМАЦЫІ"

Загадам міністра інфармацыі Уладзіміра Русакевіча на тры месяцы прыпынены выхад гродзенскай газеты "Біржа інфармацыі".

Падставай для гэтага стала рашэнне суда Ленінскага раёна Гродна аб пакаранні галоўнага рэдактара "Біржы інфармацыі" за артыкул "Здрада ў імя народа". Суд палічыў, што ў згаданым артыкуле "БІ" распаўсюдзіла несапраўдныя звесткі, якія "не адлюстроўваюць законнай падставы прызначанага ў адпаведнасці з артыкулам 85 Канстытуцыі рэферэндума, называючы рэферэндум "выклікам грамадству" з указаннем на адсутнасць сумлення". Алена Раўбецкая, як аўтарка артыкула, была пакарана штрафам у памеры 70 базавых адзінак (1 мільён 300 тысяч рублёў). Цяпер за гэты ж артыкул быў прыпынены выхад газеты, а фармулёўка з судовага рашэння без аніякіх змяненняў перайшла і ў загад міністра. Рэдакцыя газеты "Біржа інфармацыі" мае намер абскардзіць загад міністра ў судовым парадку.

Андрэй АДЛЯНІЦКІ,
Гродна

БЕЛАРУСЫ ЗА МЯЖОЙ

ГРОДЗЕНЦЫ АДКРЫЛІ ПЕРШУЮ БЕЛАРУСКУЮ КРАМУ Ў БЕЛЬГІІ

Днямі ў Бельгіі адкрылася першая беларуская крама, дзе можна набыць таксама і беларускія харчы. Крама "Світанак" месціцца на адной з цэнтральных вуліц горада Антверпен — Ізабэльалей (Isabellalei 130), каля габрэйскага квартала.

Заснавальнікі крамы — беларускія ўцекачы з горада Гродна, жыхары якога добра вядомыя ў Беларусі сваімі прадпрымальніцкімі здольнасцямі.

Разам з бельгійцамі яны атрымалі дазвол на гандаль і ўзялі ў арэнду даволі вялікае памяшканне. Самі бізнесоўцы, якія толькі распачалі справу, пакуль не маюць шмат часу, каб распавядаць пра свой бізнес, таму карэспандэнт Радыё Свабода з'вязаўся з адным з першых наведвальнікаў крамы — каардынатарам "Беларускай Уніі" Ігарам Лазарчуком.

— Гэта начная крама, і там пераважна прадукты харчавання. Для тых, хто не можа набыць патрэбныя харчы ў вялікіх крамах, якія ўжо ўвечары зачыняюцца. Ёсць там і беларускія прадукты і з краінаў Усходняй Еўропы. Хлеб, напоі розныя, гарбата, цыгарэты.

— А што менавіта беларускага можна набыць у гэтай краме?

— Крупы! А менавіта — грэчку. Тут, у Бельгіі, грэцкія крупы не вельмі распаўсюджаныя. Потым — сала, бо тут змагаюцца з халестэрынам і сала рэдка дзе можна купіць. Напояў беларускіх няма, бо бельгійскае антыалкагольнае заканадаўства не дазваляе іх прадаваць.

Цэны ў "Світанку" крыху вышэйшыя, чым, напрыклад, у вялікіх супермаркетах, але крама мае свой асартымент і працуе ў час, калі большая частка гандлёвых цэнтраў ужо зачынена, таму шанц зарабіць неблагі. Спадар Лазарчук кажа, што ў будучыні на базе крамы "Світанак" плануецца стварыць нешта накшталт беларускага цэнтра — прадаваць там беларускія кнігі, паштоўкі, музычныя запісы, сувеніры.

Радыё Свабода

НАВІНЫ

АДНЫМ ПАМЯЦЬ, А ІНШЫМ БЯСПАМЯЦТВА

ЛІДА. Лідскі райвыканкам на сваім апошнім пасяджэнні разгледзеў зварот старшыні рэгіянальнага мемарыяльна-культурнага грамадскага аб'яднання А.Сувалкінай наконт дазволу ўсталявання памятнага знака на месцы былых яўрэйскіх могілак. І выканкам прыняў рашэнне ўстанавіць такі знак у Лідзе у раёне вуліцы Фрунзе.

Знак уяўляе сабой вялікі камень з надпісам. Ён знаходзіцца цяпер у майстэрні мясцовага мастака Рычарда Грушы і амаль гатовы.

Тыповая сітуацыя надарылася і ў Мастах, але там улады паступілі інакш. На пачатку гэтага года дэпутаты Лунненскага сельскага савета, каб ушанаваць памяць бязвінна загінуўшых землякоў, напярэдадні 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прынялі рашэнне ўсталяваць памятны знак на месцы яўрэйскага гета, якое існавала ў мястэчку ў гады вайны і вязняў якога — болей за 1 500 чалавек — накіравалі ў Трыблінку і Асвенцым.

Гэта рашэнне было для ўзгаднення накіравана ў Мастоўскі райвыканкам. Праз паўгода сельсавет атрымаў адказ, у якім гаварылася, што мясцовыя дэпутаты не мелі права прымаць такое рашэнне, бо не была вытрымана працэдура, а менавіта — не было даведкі з архіва, што такі факт меў месца.

Раз усіх яўрэяў мястэчка знішчылі ў вайну, а іх далёкія сваякі жывуць ад Аргенціны да Канады, то хто возьмецца за аднаўленне памяці ахвяраў вайны, сказаць немагчыма.

БЕСПЕРСПЕКТЫЎНЫ СЕЛЬСАВЕТ


МАСТЫ. На тэрыторыі Глядавіцкага сельсавета знаходзіцца 13 вёсак, дзе пражываюць 1 240 чалавек. Толькі ў пяці населеных пунктах ёсць крамы. З-за адсутнасці моладзі там няма ні адной сярэдняй школы, ёсць толькі тры базавыя. Скарачаюцца і рабочыя месцы. За апошні час у СВК "Над Нёманам" колькасць адзінак трактарнай тэхнікі паменшылася з 50 да 30.

"БЕЛАРУСБАНК" ПАШЫРАЕЦЦА

МАСТЫ. У сувязі з закрыццём у Мастах аддзялення "Прiорбанка", якое знаходзілася ў новым будынку раённага Дома культуры, гэта памяшканне зойме "Беларусбанк". Там размесціцца толькі аперацыйная зала, што дасць магчымасць павысіць культуру абслугоўвання насельніцтва, а таксама для зручнасці кліентаў усталююць банкаматы. Адміністрацыя застанецца ў былым будынку, але папярэдне там зробяць рамонт.

Антон МАКЕЙ

НАЛОГИ



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

✓ Деньги из-за границы — головная боль для получателей

ПОЛУЧИЛ ПЕРЕВОД — НЕ СПЕШИ ТРАТИТЬ

ЧАСТНЫЕ ДЕНЕЖНЫЕ ПЕРЕВОДЫ ИЗ-ЗА РУБЕЖА ТЕПЕРЬ СЧИТАЮТСЯ ИНОСТРАННОЙ ПОМОЩЬЮ

Отныне частные денежные переводы, приходящие в Белоруссию от граждан других государств, необходимо в 5-дневный срок регистрировать в Департаменте по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

